УДК 821.161.1–14«20»Поликанина DOI 10.63874/2218-029X-2025-1-69-73

***Марыя Васільеўна Бугаева***
*аспірант 2-га года навучання каф. беларускага і рускага літаратуразнаўства*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Maria Bugaeva***
*3-d Year Postgraduate Student of the Department of Belarusian and Russian Literary Studies*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: masha.svetlova.1997@mail.ru

# МАТЫЎ ДОМА Ў ВЕРШАХ ЗБОРНІКА «ЖИВОЕ ЗЕРНО» В. ПАЛІКАНІНАЙ

*У лірыцы В. Паліканінай, вядомага сучаснага рускамоўнага аўтара Беларусі, значным і частотным матывам з'яўляецца матыў дома, які выразна дэманструе літаратурны і культурны мікракосм і макракосм. Матыў дома выступае як рэалізацыя нацыянальных культурных уяўленняў, сродак рэпрэзентацыі ўспамінаў і жыццёвага вопыту лірычнага героя, інструмент выказвання аўтарскага светапогляду, індыкатар душэўнага стану актара твораў гэтага аўтара. Адзначаецца, што распрацоўка матыву дома ў творах В. Паліканінай блізкая да біблейскіх паданняў, дзе зямное жыццё чалавека разглядаецца як часовы дом, падрыхтоўка да здабыцця нябеснага прытулку. Акрамя таго, В. Паліканіна звяртаецца да вобраза дома дзяцінства як страчанага раю, напоўненага клопатам блізкіх і радасцю сямейнага цяпла.*

***Ключавыя словы:*** *матыў, матыўны комплекс, матыў дома, В. Паліканіна, рускамоўная жаночая паэзія Беларусі.*

## *The Motif of the House in the Poems of the Collection «Live Grain» by V. Palikanina*

*In the lyrics of V. Palikanina, a famous modern Russian-language author of Belarus, the motif of the house is a significant and frequent motif, which clearly demonstrates the literary and cultural microcosm and macrocosm. The motif of the house acts as the realization of national cultural ideas, a means of representing the memories and life experience of the lyrical hero, a tool for expressing the author's worldview, an indicator of the mental state of the actor of the works of this author. It is noted that the development of the motif of the house in the works by V. Palikanina is close to biblical legends, where a person's earthly life is considered as a temporary home, preparation for gaining a heavenly refuge. In addition, V. Palikanina turns to the identification of the childhood home as a lost paradise, filled with the care of loved ones and the joy of family warmth.*

***Key words:*** *motif, motif complex, motif of the house, V. Palikanina, Russian-language women's poetry of Belarus.*

### Уводзіны

Паняцце «жаночая паэзія» было ў 1983 г. ўведзена ў беларускае літаратуразнаўства акадэмікам У. Гніламёдавым, калі вучоны ў сваёй кнізе «Сучасная беларуская паэзія: творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс» адзначыў: «У літаратуры існуе паняцце "жаночая лірыка"» [1, с. 235]. Асноўнай задачай жаночай паэзіі з'яўляецца праблематызацыя жыццёва важнага для паэзіі адрознення – «мужчынскага» і «жаночага».

На сённяшні дзень «жаночае» ў паэзіі не ўспрымаецца як нешта зневажальнае незразумелае і другараднае, супрацьпастаўленае «мужчынскаму». Наадварот, яно разглядаецца праз прызму «іншае», маркіраванае псіхалагічнымі, біялагічнымі, сацыякультурнымі і асобаснымі рысамі. На думку беларускай даследчыцы С. Калядкі, «сучасную жаночую паэзію прадстаўляюць не адзінкі, а дзясяткі імёнаў» [2, с. 4].

Яркай прадстаўніцай жаночай рускамоўнай паэзіі Беларусі з'яўляецца Валянціна Пятроўна Паліканіна (нарадзілася ў 1958 г.) – паэт, перакладчык, празаік, публіцыст, член Міжнароднай федэрацыі рускамоўных пісьменнікаў, лаўрэат прэміі Саюза журналістаў Беларусі (2003), спецыяльнай Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Мастацкая літаратура» (2006). Эстэтычныя арыентацыі і каштоўнасныя канстанты выразна праяўляюць сябе ў паэзіі В. Паліканінай у матыве дома, які, уплята-

---

*Навуковы кіраўнік – Людміла Міхайлаўна Садко, кандыдат філалалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры беларускага і рускага літаратуразнаўства і журналістыкі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*

ючыся ў вершы аўтара бытавым і быццёвым кантэкстам, набывае статус феномена – шматаспектнага паняцця.

У канцы ХХ ст. цікавасць даследчыкаў да праблемы выдзялення і ідэнтыфікацыі матыву як самастойнай літаратуразнаўчай катэгорыі ўзмацнілася. Актуальнасць вывучэння матыву і яго функцый у лірычным творы заключаецца ў тым, што семантычнае напаўненне матыву знаходзіцца ў цесным узаемадзеянні з сацыякультурнымі ўстаноўкамі пісьменніка, адлюстроўвае асаблівасці эстэтыкі і паэтыкі таго ці іншага перыяду развіцця літаратурнага працэсу. Выяўленне і аналіз матываў выразна эксплікуе нацыянальную карціну свету, дазваляе ў падрабязнасцях разгледзець індывідуальна-аўтарскія асаблівасці светапогляду пісьменніка.

Разуменне матыву як дыхатамічнага паняцця, дзе спалучаюцца і абагульненыя ўяўленні аб рэчаіснасці, і іх увасабленне ў канкрэтных мастацкіх сродках, абапіраецца на дактрыну акадэміка А. Весялоўскага, які лічыць, што матыў суадносіцца з архетыпам, што гэта «формула, образно отвечающая на первых порах общественности на вопросы, которые природа всюду ставила человеку, либо закрепляющая особенно яркие, казавшиеся важными или повторявшиеся впечатления действительности» [3, с. 500].

Пры ўсёй разнастайнасці навуковых стратэгій застаецца нямала пытанняў, якія прадугледжваюць разгляд і вывучэнне функцый і ролі матыву ў мастацкім тэксце.

Мэта даследавання – выяўленне асаблівасцяў рэалізацыі матыву дома ў лірыцы В. Паліканінай са зборніка «Живое зерно» (2006).

**Тэорыя матыву ў сучасным літаратуразнаўстве**

Тэрмін «матыў» шырока выкарыстоўваецца не толькі ў літаратуры, але і ў іншых галінах, такіх як музыказнаўства, псіхалогія, мовазнаўства, крыміналістыка. Першапачаткова дадзенае паняцце сфарміравалася як спецыяльны музычны тэрмін, але цяпер выкарыстоўваецца і ў літаратуразнаўстве, дзе не толькі з'яўляецца ключавым кампанентам аналіза структуры мастацкага тэкста, але і дапамагае чытачу на эмацыйным і інтэлектуальным узроўнях зразумець глыбінныя ідэі твора, яго паэтычную напоўненасць.

У свой час А. Весялоўскі ў працы «Поэтика сюжетов» (1913) паспрабаваў размежаваць паняцці «матыў» і «сюжэт». Пад матывам вучоны меў на ўвазе «простейшую повествовательную единицу, образно ответившую на разные запросы первобытного ума или бытового наблюдения» [3, с. 305]. Вучоны пісаў, што «при сходстве или единстве бытовых и психологических условий на первых стадиях человеческого развития такие мотивы могли создаваться самостоятельно и вместе с тем представлять сходные черты» [3, с. 305]. Пад сюжэтам жа ён разумеў «тему, в которой снуются разные положения – мотивы» [3, с. 305]. Матывы, такім чынам, адрозніваюцца прастатой і ўстойлівасцю; сюжэты – больш складаныя адзінкі, яны і вар'іруюцца, камбінуюцца, убіраючы ў сябе новыя матывы.

Вучоны Б. Гаспараў адзначае, што ў ролі матыву «может выступать любое смысловое пятно – событие, черта характера, элемент ландшафта, любой предмет, произнесенное слово, краска, звук; единственное, что определяет мотив, – это его репродукция в тексте» [4, с. 34]. Зыходзячы з гэтага, адны матывы больш відавочныя, бо пацвярджаюцца ў розных кропках тэкста, іншыя – семантычна больш слабыя, другарадныя.

Пераклічка і ўзаемасчапленне матываў утвараюць сістэму сазлучаных суб'ектных сфер, незамкнутае семантычнае поле, якое робіць мастацкі твор адкрытым, шматаспектным дзякуючы ўзнікаючым асацыятыўным сувязям. Важна адзначыць, што матыў, развіваючыся, семантычна ўзбагачаючыся, валодае здольнасцю то сыходзіць у падтэкст, то выразна выяўляцца, выходзячы на першы план, фіксавацца ў знешнім ладзе мастацкага твора, рэалізуючыся на ўзроўні канкрэтнага вобраза.

Пад лірычным матывам мы разумеем кантэкстуальна абумоўленую, акцэнтаваную аўтарам структурную адзінку, сэнсавы элемент, слова-вобраз мастацкай семантыкі, паўтаральны і варыятыўны кампанент твора (слова, словазлучэнне, назва твора, эпіграф, прысвячэнне, вядучая тэма, сімвал і г. д.). Напрыклад, літаратуразнаўца І. Фаменка адзначае, што «любимые слова поэта порождают излюбленные мотивы и обратно» [5, с. 96].

Лірычны матыў у максімальнай ступені валодае здольнасцю да мадыфікацыі і сэнсавай неадназначнасці, тэкст у такім выпадку «скреплен ассоциативно связанными лексемами, буквальное и метафорическое значение которых наслаивается друг на друга» [6, с. 21]. Матыў у лірыцы можа быць паспяхова выдзелены ў рамках кантэксту (цыкл вершаў, зборнік, збор твораў аўтара, сукупнасць тэкстаў нейкага мастацкага напрамку, плыні, эпохі літаратурнага развіцця. Больш складаным уяўляецца вылучэнне матываў у асобным вершы (асабліва мінімальным па аб'ёме) без уліку праяўленасці варыянта і інварыянта гэтага матыву ў іншых тэкстах аднаго ці некалькіх аўтараў.

**Матывы і матыўныя комплексы ў вершах зборніка В. Паліканінай «Живое зерно»**

Кніга «Живое зерно» (2006) ўключае ў сябе выбраныя вершы самабытнага рускамоўнага паэта Беларусі В. Паліканінай, якая малюе мастацкую біяграфію чалавека, жанчыны, паднімае вечныя тэмы жыцця і кахання, слова і творчасці, сапраўдных і ілжывых каштоўнасцей. Разважаючы над гэтымі пытаннямі, паэтка шматразова звяртаецца да матыву дома, які наогул адносіцца да канцэптуальных і прадуктыўных матываў літаратуры і мастацтва, носіць комплексны міфагенны характар, можа быць суаднесены з паняццем вечных вобразаў культуры, што ўдзельнічаюць у фарміраванні як універсальнай, так і індывідуальный карціны свету.

Ва ўспрыманні лірычнага героя вершаў В. Паліканінай са зборніка «Живое зерно» дом становіцца «покровительствующей силой» [7, с. 53].

Гарманічны свет дзяцінства намаляваны ў вершы В. Паліканінай «Еще задолго до моих стихов…». Выкарыстоўваючы жанравыя традыцыі ідыліі, аўтар малюе дом бабулі і дзядулі – не проста месца, топас, а паўміфічны адушаўлёны магічны арганізм, дзе ў коміна *«горячая спина»* [8, с. 8]:

*Мурлыкал кот, и горло драл петух,*
*Скрипели важно ходики по кругу.*
*И жил в углу иконописный дух,*
*А бабушка была ему подругой* [8, с. 8].

Спакой і манументальнасць, непарушнасць дома як захавальніка радавых традыцый падкрэсліваецца і выкарыстаннем ідэальнага хранатопу: тут прыбраная зіма, прыгожы двор вакол хаты, час малюецца не жорсткім перыядам выжывання, які мяжуе са смерцю, а часам летуценнасці, задуменнасці – якасцей, што дазваляе сабе дзіця ці дарослы, звыклыя да дабрабыту:

*Цвела зима над бабушкиным домом,*
*Роняла пух с небесных потолков*
*И таяла, как леденец в ладони»* [8, с. 8].

У вершы хата – носьбіт казачных, чароўных рыс, наўмысна падкрэсленых увасабленнямі і метафарамі: *«цвела зима»*, *«гудело слово ветра»*, *«печной трубы горячая спина»* [8, с. 8]. Дом для лірычнай гераіні – сакральнае месца, скарбніца духоўных каштоўнасцей (*«в углу иконописный дух»* [8, с. 8]) і ўспамінаў пра бабулю з яе штовячэрнімі справамі (*«молитва каждый вечер»* [8, с. 8]), а таксама пачатак усяго – зыходная кропка, з якой пачынаюцца і грахі, і вершы, і *«первый звук проклюнувшейся речи»* [8, с. 8].

Лірычная гераіня з акрэсленымі аўтабіяграфічнымі рысамі разумее дом свайго дзяцінства як галоўную крыніцу творчага натхнення.

Ціхамірнае дзяцінства ў вясковай хаце апісана В. Паліканінай і ў вершыўспаміне «Зима моего детства». Дом бабулі атачае атмасфера казкі і весялосці, і сам ён не пахіленая хата, а чароўны церам, які стаіць *«по пояс в снегу»* [7, с. 13].

Лірычнай гераіні дом і двор уяўляюцца чымсьці казачна-нерэальным: *«бархатные ветки»* з сініцамі, *«морозная яркая небыль»*, *«на крышах дымки-маяки»* [8, с. 13]. Важна адзначыць, што дом у гэтым вершы не столькі выяўляе хранатоп, колькі адлюстроўвае настрой, думкі лірычнай гераіні, яе псіхалагічны стан.

Верш-успамін «Жизнь без сучка и без задоринки» прасякнуты ўспамінамі лірычнай гераіні пра жыццё ў горадзе з бацькамі. Дом тут сціплы, стаіць у *«маленьких двориках, где жмутся лавочки к домам»* [8, с. 12], аўтар, з аднаго боку, стварае ўніверсальны малюнак звычайных ўпарадкаваных дзён жыхара *«детской страны»*, але з другога – з персаніфікаванымі падрабязнасцямі, адзначанымі з замілаваннем і любоўю:

*Тропинка, к школе побежавшая,*
*И недоеденный обед,*
*И встреча, счастье обещавшая,*
*Вдали от бед, вблизи от бед;*
*Любовь, от первых слез спасенная, –*
*Все это было-сплыло тут* [8, с. 12].

Верш дэманструе сталенне гераіні ў шчасным бацькоўскім доме: пасля шумных дзіцячых гульняў на *«солнцем выбитом лужке»* [8, с. 12] – школа з *«законами арифметики»*, потым – першае каханне. Варта адзначыць, што матыў дома ў гэтым вершы атрымлівае распрацоўку ў інварыянце *«маленький дворик, где жмутся лавочки к домам»*, пашыраецца, дом перастае быць лакальным месцам, становячыся цэлым сусветам, «территорией детства».

Матыў дома ў вершы рэпрэзентуецца таксама праз вобразы мамы, сонца і кахання, якія асацыятыўна звязаны з самымі станоўчымі пачуццямі ў жыцці чалавека. Для я-персанажа верша дом звязаны з духоўнай чысцінёй і безумоўным прыняццем, калі яшчэ не існуе «свайго» і «чужога» гора: *«Когда соседская история тебе не кажется чужой»* [8, с. 12]. Адзначым, што дом, намаляваны ў гэтым творы, існуе ўжо толькі ў цёплых успамінах, напоўненых горыччу шкадавання па «страчаным раі»:

*Ах, эти дворики снесенные*
*Теперь лишь в памяти живут* [8, с. 12],

што актуалізуе міжматыўныя ўзаемасувязі з матывам памяці.

Такое ж перапляценне матываў дома і памяці адзначаецца і ў спавядальным вершы В. Паліканінай «Мне помнится все, что случается…». Тут дом – гэта месца, якое нагадвае лірычнай гераіні пра першыя гісторыі яе кахання:

*Дорог задумчивый – с Грушевки – мальчик.*
*И тот – из российской глубинки,*
*Что стал женихом*» [8, с. 17].

Паэтка ў гэтым творы насычае матыў дома інварыянтамі «дом-радзіма», «дом-горад», ствараючы выявы двара з гуляючай дзятвой і *«серой лавчонкой»* са старым, які сядзіць на ёй [8, с. 17], узнаўляючы мікраёна Грушаўку, мілыя сэрцу ўтульныя мінскія бульвары. Пашыраючы ўрбаністычную прастору, узводзячы яе ў абсалют, паэтка вуснамі лірычнай гераіні прызнаецца:

*И люб этот город – атласный, ажурный, лоскутный –*
*И родина – с тем островочком, что детством зову* [8, с. 17].

Дзяцінства і юнацтва лірычнай гераіні – гэта толькі *«островок»*, малая частка няпростага жыццёвага шляху, але гэта тое, за што варта трымацца, паколькі цёплыя ўспаміны пра дом і радзіму не толькі вяртаюць у бесклапотныя моманты дзяцінства, але і ўсяляюць надзею, што ўсё гэта паўторыцца, вернецца:

*Мне помнится все, что случается,*
*Что возвратимо* [8, с. 17].

У вершы «Мне помнится все, что случается…» ідылічны гарадскі пейзаж, які ахінае родны шматпавярховік, толькі падкрэслівае цёплую афарбоўку ўспамінаў лірычнай гераіні. Матыў дома-радзімы і дома-горада непарыўна злучаны з вобразамі любові, святла, сонца і месяца:

*Закаты, рассветы, оседлая невозмутимость*
*Залюбленных лун, заблудившихся в кронах дерев* [8, с. 17].

У вершы-звароце «Мои песочные часы твое отсчитывают время» матыў дома набывае семантыку абараняючай і аберагаючай сілы. Ёй супрацьпастаўлена «чужая» прастора, якая не ўваходзіць у межы хатняга і таму здаецца я-персанажу нечым інфернальным, небяспечным і незнаёмым, што апісваецца як *«тьма»*, *«бездонность мглы»*, *«долина странствий»*. У гэтую дарогу, мяркуючы па ўсім, выпраўляецца самы дарагі для лірычнай гераіні чалавек – яе дзіця. У вершы матыў дома цесна звязаны з вобразамі дарогі/падарожжа і ўтварае з імі матыўны комплекс, дзе ўзаемасуадносяцца супрацьлегласці – хата і шлях. Утульная абжытая прастора мацярынскага дома супрацьпастаўлена неўладкаванасці дарогі і яе выпрабаванням. Сыход з хаты тут становіцца некаторым падабенствам ініцыяцыі, якую дзіцяці неабходна прайсці, каб пасталець і адужэць, што маці разумее, з гатоўнасцю ахвяруючы сваімі інтарэсамі і пачуццямі:

*Лишь только ты покинешь дом –*
*Я стану снегом, стану льдом,*
*Но только ты гори, как прежде* [8, с. 22].

У вершы «Мои песочные часы твое отсчитывают время» прастора і час дома

выступаюць як малыя, нязначныя, але пры гэтым надзейныя і бяспечныя. Распрацоўваючы тут матыў дома, В. Паліканіна ўводзіць у мастацкі свет верша амбівалентны матыў дарогі/падарожжа, якія асацыіруюцца з бяздом'ем, вандроўніцтвам, вобразам «блуднага сына».

**Заключэнне**

Дом, які намаляваны ў вершах зборніка «Живое зерно» В. Паліканінай, – гэта месца светлых дзіцячых успамінаў, ідэалізаваная, светлая і гасцінная прастора, звязаная з пачуццямі кахання, абароненасці, даверу. Варта адзначыць, што лексема «дом» і яе розныя формы паўтараюцца больш за 30 разоў, сустракаючыся ў 18 вершах. Матыў дома ў вершах зборніка звязаны з цёплымі ўспамінамі лірычнай гераіні пра дзяцінства і юнацтва ў бацькоўскай гарадской («Жизнь без сучка и без задоринки», «Мне помнится все, что случается…») і дзедаўскай вясковай («Еще задолго до моих стихов…», «Зима моего детства») хатах і дэманструе глыбокія пачуцці падзякі, любові і абароненасці. Выкарыстанне прыёмаў дзённікавасці, спавядальнасці і элегічнага модусу суму па страчаным раі – дзяцінству цесна звязаным з увасабленнем матыву дома, таксама ляжаць у аснове мастацкага свету вершаў зборніка В. Паліканінай. Матыў дома праяўляецца ў шэрагу інварыянтаў (сям'і, памяці, любові, скарбніцы, вёскі, горада, радзімы), падкрэслівае духоўнасць і мудрасць лірычнай гераіні, яе непарыўную сувязь з каранямі.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Гніламёдаў, У. В. Сучасная беларуская паэзія: творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс / У. В. Гніламёдаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 304 с.

2. Калядка, С. У. Беларуская сучасная жаночая паэзія: мастацкія канцэпцыі «жаночага шчасця» / С. У. Калядка. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – 163 с.

3. Веселовский, А. Н. Историческая поэтика / А. Н. Веселовский. – Л., 1940. – 596 с.

4. Гаспаров, Б. М. Литературные лейтмотивы. Очерки по русской литературе XX века / Б. М. Гаспаров. – М. : Вост. лит., 1993. – 304 с.

5. Фоменко, И. В. Лирический цикл: становление жанра, поэтика / И. В. Фоменко. – Тверь : ТГУ, 1992. – 123 с.

6. Полухина, В. П. Проза Иосифа Бродского. Продолжение поэзии другими средствами / В. П. Полухина // Поэтика Иосифа Бродского : сб. науч. тр. ; редкол.: В. П. Полухина [и др.]. – Тверь : Твер. гос. ун-т, 2003. – С. 9–27.

7. Башляр, Г. Земля и грезы о покое / Г. Башляр. – М. : Изд-во гуманитар. лит., 2001. – 320 с.

8. Поликанина, В. П. Живое зерно : избранная лирика / В. П. Поликанина. – Минск : Четыре четверти, 2006. – 200 с.

REFERENCES

1. Hnilamiodau, U. V. Suchasnaja bielaruskaja paezija: tvorchaja indyvidual'nasc' i litaraturny praces / U. V. Hnilamiodau. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1983. – 304 s.

2. Kaliadka, S. U. Bielaruskaja suchasnaja zhanochaja paezija: mastackija kancepcyi «zhanochaha shchascia» / S. U. Kaliadka. – Minsk : Bielarus. navuka, 2010. – 163 s.

3. Viesielovskij, A. N. Istorichieskaja poetika / A. N. Viesielovskij. – L., 1940. – 596 s.

4. Gasparov, B. M. Litieraturnyje liejtmotivy. Ochierki po russkoj litieraturie XX vieka / B. M. Gasparov. – M. : Vost. lit., 1993. – 304 s.

5. Fomienko, I. V. Lirichieskij cikl: stanovlienije zhanra, poetika / I. V. Fomienko. – Tvier' : TGU, 1992. – 123 s.

6. Polukhina, V. P. Proza Iosifa Brodskogo. Prodolzhenije poezii drugimi sriedstvami / V. P. Polukhina // Poetika Iosifa Brodskogo : sb. nauch. tr. ; redkol. : V. P. Polukhina [i dr.]. – Tvier' : Tvier. gos. un-t, 2003. – S. 9–27.

7. Bashliar, G. Ziemlia i griozy o pokoje / G. Bashliar. – M. : Izd-tvo gumanitar. lit., 2001. – 320 s.

8. Polikanina, V. P. Zhivoje zierno : izbrannaja lirika / V. P. Polikanina. – Minsk : Chietyrie chietvierti, 2006. – 200 s.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 15.04.2025*